Сычова С.А.

Адам Міцкевіч (1798-1855)

Нарадзіўся А.Міцкевіч 24 снежня 1798 г. на хутары Завоссе (цяпер Баранавіцкі раён) у сям'і збяднелага шляхціца. Ён быў сынам наваградскага адваката Мікалая Міцкевіча і Барбары з Маеўскіх. Міцкевічы былі паланізаванымі беларусамі, паэт называў сябе «ліцвінам». Прырода Наваградчыны, героіка-гістарычнае міналае гэтага края, народныя песні і паданні сфарміравалі светапогляд будучага паэта і сталі асноўнай крыніцай яго творчасці.

Пасля заканчэння Наваградскай школы ў 1815 г. паступае ў Віленскі універсітэт, на фізіка-матэматычны факультэт. Праз год Міцкевіч пераводзіцца на гісторыка-літаратурны факультэт.

У 1817 годзе разам з Тамашом Занам і Юзафам Яжоўскім Адам Міцкевіч стварае тайнае студэнцкае згуртаванне – Таварыства філаматаў (аматараў навук), пазней – Таварыства філарэтаў (аматары дабрачыннасці). Гэтыя згуртаванні моладзі адыгралі важную ролю ў грамадскім і культурным жыцці Беларусі. Тады ж Адам Міцкевіч пачаў сам складаць вершы, якія чытаў на філамацкіх пасяджэннях. У паэме «Мешка, князь Навагрудка», апавяданні «Жывіла», шэрагу вершаў упершыню з'яўляецца прывабны вобраз рамантычнага героя-барацьбіта за свабоду і шчасце народаў Літвы і Бларусі. Паэма «Мешка, князь Навагрудка» паказвае няпросты шлях князя. У пачатку паэмы Мешка паўстае перад чытачом як «тупа-ганарысты», «што рухам шапкі скіне свет з пасады»,яму супрацьпастаўлены Парай, былы воін, «што рускіх біў цароў яшчэ з Альгердам». Мешка патрапіў у палон да Мамая, дзе ўбачыў сваю каханую Зылю, якая падштурхоўвае князя да барацьбы за сваю годнасць, Радзіму, дапамагае яму здзейсніць план вызвалення. Твор заканчваецца перамогай над Мамаем, аднак Мешка дае Мамаю волю, таму што яго набег адкрыў яму вочы і дапамог зразумець свае памылкі. Варта адзначыць ролю жанчыны ў станаўленні героя. Менавіта яна падштурхнула героя да барацьбы.

Верш «Ода да маладосці» быў напісаны ў 1820 г., пазней з ім ішлі ў бой паўстанцы 30-х гадоў, таму што асноўнай думкай была ідэя ўсеагульнага братэрства і волі. У форме і паэтыцы адчуваецца ўплыў класіцызму, адначасова твор прасякнуты ідэямі бунтарства, кліча да замагання за волю.

У 1822 годзе выйшаў першы том зборніка Міцкевіча «Балады і рамансы», у наступным годзе – другі том. Выданне кнігі стала сапраўднай сенсацыяй, а прадмова да яе паслужыла маніфестам новага літаратурнага кірунку – рамантызму.

Аснову першага тома «Паэзіі» склалі балады і рамансы. Неабходна адзначыць, што балады «Пралеска» і «Рамантычнасць» успрымаюцца як

маніфест рамантызму. У баладзе «Пралеска» першая вясновая кветачка, як рамантычная паэзія, з’явілася рана, таму не ўсе яе разумеюць і прымаюць. А балада «Рамантычнасць» паказвае перавагу рамантычнага светаўспрымання, якое акцэнтуе увагу на пачуццях чалавека, над рацыянальным класіцыстычным, што зразумела не ўсім.

Большасць баладаў заснаваны на фальклорным матэрыяле. Творы «Свіцязанка», «Свіцязь», «Рыбка» аб’яднаны воразам возера Свіцязь. «Свіцязанка» – першая апублікаваная балада, яна найбольш перагукваецца з еўрапейскімі рамантычнымі творамі. У ёй хлопец пакараны за здраду каханай. У аснову балады «Свіцязь» пакладзена паданне пра з’яўленне возера Свіцязь. У творы гучаць патрыятычныя матывы. Князь Туган павінен выбраць паміж выкананнем свайго абавязку перад Радзімай і жаданнем зберагчы родны горад. Яму дапамагае дачка, якая кажа, што бачыла сон: яны застануцца пад аховай вышэйшых сіл. І, калі ворагі асадзілі горад, то дзяўчаты робяць выбар паміж жыццём у няволі і смерцю: яны просяць выратавання праз страту жыцця. І вышэйшыя сілы ператвараюць іх у цар-кветкі, ад якіх пасля гінуць ворагі. У дадзеным выпадку смерць праз пераўтварэнне паказваецца як працяг жыцця, і адначасова пакранне ворагаў за амаральны ўчынак (знішчэнне мірных жыхароў). Варта адзначыць, што гэты твор складаецца з дзвух гісторый, якія звязваюць сучаснасць і мінулае. З возера пастаянна чуюцца дзіўныя гукі, юнак вырашае даведацца: хто там жыве. Яны злавілі ундзіну, якая пакідае ім жыццё, таму што прыйшлі да возера з Божым словам, таму што сярод загінуўшых ёсць сваякі хлопца. Цікавая акалічнасць: ундзіна-русалка праява паганскага веравызнання, слова Божае – хрысціянскага; дзяўчаты просяць смерці як выратавання – ім дапамагаюць. Можна сказаць, што так паказваецца спалучэнне паганскіх і хрысціянскіх поглядаў у свядомасці беларусаў. Балада «Рыбка» закранае не толькі тэму вернасці ў каханні, але і сацыяльнай няроўнасці. Так паніч кахаў дзяўчыну, у іх нарадзілася дзіця, але ён ажаніўся на іншай. Дзяўчына не вытрымала сораму і пакуты, скончыла жыццё самагубствам. Вось тут і разгортваюцца трагічныя падзеі. Слуга прыносіць дзіця да возера, дзяўчына выходзіць яго карміць і зноў знікае. Яна знаходзіцца паміж светам жывых і светам мертвых. Сустрэча з былым каханым, яго жонкай заканчваецца трагічна для пары закаханых. Вышэйшыя сілы ператвараюць іх у валун, а душа дзяўчыны знаходзіць спакой, таму яна больш не выходзіць з возера.

У баладах Адама Міцкевіча гучыць народны матыў непазбежнай абплаты за амаральныя ўчынкі (У.Мархель). Гэта бачым і баладах «Лілеі», «Уцёкі», «Тукай, або Выпрабаванне дружбы».

Даследчыкі (М. Лапідус) сцвярджаюць, што першы зборнік паэта стаў этапным для развіцця польскай літаратуры, вызначыў накірунак яе развіцця.

Новая паэзія павінна абапірацца на народны светапогляд, на рамантычным, а не рацыянальным пазнанні чалавека і света. Уплыў беларускай культуры адчуваеўся не толькі ў звароце да народных паданняў, але і ў значнай колькасці беларусізмаў у творах, рытміцы народных песень.

У другі том «Паэзіі» увайшлі літоўская паэма «Гражына», II і IV часткі «Дзядоў». У паэме «Гражына» на першы план выходзіць тэма вернасці свайму народу, краю. Аўтар стварае вобраз жанчыны-патрыёткі, жанчыны-дарадцы, жанчыны-ваяра. Гражына паказана як прыгожая жанчына, якая побач з мужам і ў сямейным жыцці, і на ратным полі. Яна даведваецца ад Рымвіда, што да князя прыязжалі крыжакі, з якімі Літавор гатовы пайсці на змову з-за асабістай крыўды. Такім чынам, ён здрадзіць. Гражына не можа дапусціць, каб муж-князь асабістые праблемы паставіў вышэй за дзяржаўныя. Зразумеўшы, што адгаварыць яго немагчыма, яна прымае рашэнне біцца замест яго. Гражына абараніла сваю дзяржаву, але сама загінула. Яе ўчынак прымусіў Літавора змагацца, абараняць сваю краіну,  забыўшыся пра крыўды. У гэтым творы побач з Гражынай, Літаворам аўтар паказвае і Рымвіда, чалавека, які шмат год служыў князю і які імкнецца ўратаваць яго ад непрыстойнага ўчынку.

Паэма цікава не толькі сваім рамантычным, патрыятычным пафасам, але і формай падачы матэрыялу: спалучэннем лірычнага і эпічнага пачаткаў, аднаўленне атмасферы сярэднявечча, што дазваляе лічыць твор рамантычным, і адначасова выкарыстанне метафар і параўнанняў, якія ўласцівы літаратуры класіцызма. Паэма «Гражына» – пераходны ад класіцызму да рамантызму твор. Рысы класіцызму: персанажы – прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў, апісанне гераічных учынкаў, арыентацыя на антычнае мастацтва (на «Іліяду» Гамера: напрыклад, Гражына са зброяй Літарвора ідзе ў бой – Патрокл са зброяй Ахіла гіне ў бойцы з Гектарам; Літавор, помсцячы забівае нямецкага рыцара – Ахіл забівае Гектара). Рысы рамантызму: рыцарскія адносіны да жанчыны, апісанне замка, з’яўленне таямнічага чорнага рыцара. Новае, што ўнёс Міцкевіч у літаратуру гэтым творам, гэта псіхалагізм у абмалёўцы персанажаў (асабліва Гражыны). Паэт у творы займае месца назіральніка, пераказвае падзеі ў той паслядоўнасці, у якой яны адбываліся – такім чынам, захоўваецца класічны прынцып адзінства дзеяння. Аднак чытачу не ўсё зразумела, і ў эпілозе аўтар дае тлумачэнні, гаворыць пра тое, што гэтая гісторыя дайшла ў запісах невядомага аўтара, а пасля паэт нібыта пачуў яе ў размове з былым пажам Гражыны.

Гэта быў плённы час для творчасці. Важную ролю адыграла Марыля – сястра сябра Міцкевіча Міхала Верашчакі. Браты Марылі, Міхал і Юзаф, былі філарэтамі, пад іх уплывам яна цікавілася рамантычнай літаратурай і добра ведала паэзію. Яны пазнаёміліся летам 1817 года, успыхнула каханне, аднак

Марыля і Адам павінны былі растацца: яна была заручана з графам Путкамерам і неўзабаве выдадзена замуж, ён павінен быў ехаць на працу ў Коўна. Каханне паэта было трагічным, прынесла нямала душэўных пакут. Неабходна звярнуць адзначыць ролю кахання ў небывалым творчым узлёце Міцкевіча: каханне да Марылі Верашчакі, якой прысвечаны многія яго творы (М.Хаустовіч – «феномен Марыі Верашчакі»). Духоўныя пошукі маладога Міцкевіча адлюстраваны ў шэрагу твораў. Напрыклад, у паэме «Дзяды» Здань – гэта малады чалавек, які скончыў жыццё самагубства з-за няшчаснага кахання. У ім угадваецца сам паэт, можна прасачыць змены ў яго душэўным стане.

Незвычайнай па сваей будове, часу адлюстравання, спалучэнню рзнастайных прыёмаў з'яўляецца паэма «Дзяды». Гэты твор пісаўся на працягу ўсяго жыцця. Дзяды – гэта старажытны беларускі абрад памінання продкаў. На Дзяды (восеньскія) жывыя аддаюць даніну памяці ўсім продкам, што жылі на нашай зямлі, клічуць іх на вячэру. Паэт не проста ўзнавіў даўні абрад, але і раскрыў шэраг праблем рэчаіснасці, маральны кодэс чалавека на зямлі. Часткі II і IV часткі «Дзядоў» былі напісаны ў 20-я гады XIX стагоддзя ў Вільні і Коўне і атрымалі назву «ковенска-віленскія Дзяды». Частка III створана праз 10 год у Дрэздане, адпаведна названа «дрэзданскія Дзяды». Да гэтага часу таксама адносяць напісанне «Урыўка часткі III».

Галоўны герой тройчы пераўвасабляецца ў творы. Спачатку перад чытачамі з'яўляецца Здань. Ён прыходзіць да Гусляра ў час абраду Дзядоў. На яго запрашаюцца душы ўсіх памерлых, якія не могуць знайсці спакою. Душы прыходзяць адвольна, не ўзалежнасці ад іх віны, большасці з іх дапамагаюць, але не ўсім. Так пану, які быў вядомы сваёй жорсткцю і несправядлівасцю, адмаўляюць: «Хто не быў ніколі чалавекам, чалавек таму не дапаможа». Крук, Сава – ахвяры існуючага грамадскага ладу. Дзяўчына пакутуе таму, што ў зямным жыцці нікога не кахала. І апошняй з'яўляецца Здань.

У IV частцы Здань пераўтвараецца ў Пустэльніка, у якім ксёнз пазнае Густава. З размовы ксянза, які выконвае ролю Гусляра з II часткі, і Пустэльніка чытач даведваецца, што Пустэльнік з'яўляецца Зданню, пакутуе, таму што «з мноства выбраў я адну, і тая к іншаму пярсцёнкам прыкавана», быў філаматаратам. Ксёнз кажа словы, якія паўплывалі на маладога чалавека: «Ты, сыне мой, перад сабой і светам больш грэшны ўсё ж, чым перад Усявышнім. Мы не для слёз і смеху ў гэтым свеце, а створаны рабіць дабро ўсім бліжнім!». У далейшай спрэчцы паказваюцца два погляды на свята Дзяды, яго неабходнасці, значэнні.

Паэт у «Дзядах» перасатварае светапоглядную сістэму свайго народа – ліцвінскага, беларускага. Варшаўская крытыка выказвала незадавальненне

«беларускасцю» паэмы «Дзяды», гэтаксама, як і «Гражыны», аднак на Радзіме папулярнасць паэта расла з кожным творам.

У 1823 годзе Міцкевіча з сябрамі арыштавалі, ён правёў паўгода ў турме. Восенню 1824 г. пасля заканчэння следства паэт быў высланы ў Расію. Гэта была даволі дзіўная ссылка. Адам Міцкевіч трапіў спачатку ў Пецярбург, адкуль быў накіраваны ў Адэсу. У 1825 годзе паэт едзе ў Крым (цыкл «Крымскія санеты»), потым – у Маскву і зноў у Пецярбург.

«Крымскія санеты» з'яўляюцца рамантычным шэдэўрам. У іх апісваецца паўднёвая прырода, раскрываецца яе прагажосць у вершах незвычайнай прыгажосці. Апісанне бязмежных стэпаў, вялізарных гор, бурнага мора пераклікалася з пачуццём суму па родным краі. Усе творы прасякнуты аўтарскімі перажываннямі. Варта адзначыць, што Міцкевіч адрадзіў жанр санета, да якога звярталіся ў XVI- XVII ст.(Лапідус) . У 1826 годзе ў Маскве выдае збарнік паэзіі ***«Крымскія санеты».*** Выхад зборніка быў успрыняты як новая незвычайная з'ява ў літаратуры, рускія паэты з захапленнем перакладалі Міцкевічавы санеты. Творы адлюстроўвалі сучаснае жыццё, амаль у кожным з іх паказана драма ад сутыкнення лірычнага героя з грамадствам. Лірычны герой набывае рысы рамантычнай выключнасці, паўстае ў вобразе паэта-выгнанніка. У «Крымскіх санетах» вялікае значэнне мае экзатычны пейзаж чужога краю, на яго фоне раскрываецца душа лірычнага героя, якая імкнецца на радзіму («Чатырдаг», «Аюдаг», «Пілігрым»).

Каля пяці гадоў прабыў паэт у Расіі. Тут ён пазнаёміўся і падтрымліваў сяброўскія адносіны з дзекабрыстамі К.Рылеевым і А.Бястужавым, з А.Пушкіным, В.Жукоўскім, П.Вяземскім, А.Грыбаедавым, Я.Баратынскім і інш. Асабліва цесная дружба звязвала Міцкевіча з Пушкіным, які прысвяціў свайму «літоўскаму» сябру вядомы верш «Ён паміж намі жыў...», сябры перакладалі творы адзін аднаго. У Расіі Міцкевіч выдае кнігі паэзіі, піша новыя творы (1828 – паэма «Конрад Валенрод»).

Паэма «Конрад Валенрод» пераносіць чытача ў час войнаў Літвы з крыжакамі. У ёй уздымаецца праблема абавязку перад радзімай. Эпіграфам сталі словы Макіявелі: «Бо павінны вы ведаць, што ёсць два віды барацьбы…трэба пагэтаму быць лісой і львом». Так і галоўны герой выратоўвае свой край, аднак перад гэтым доўгі час ваюе сярод крыжакоў. У яго трагічны лес: юнаком яго забралі ў палон, выхоўвалі ў сваіх традыцыях, але памяць продкаў заўсёды жыла ў ім. Ён чакаў, рыхтаваўся да гэтага важнага моманту. Конрад ахвяруе асабістым шчасцем, аднак ёсць момант, калі ён гатовы ўсё кінуць дзеля каханай, якая засталася вернай іх пачуццям. І вось у гэты момант магістра спыняе каханая жанчына, якая даводзіць думку, што кожны абраў свой шлях і павінен яго прытрымлівацца. У.Мархель напісаў пра паэму наступныя

радкі: «Паэма заранала этычныя пытанні, праз якія паэт імкнуўся сцвердзіць права прыгнечанага на барацьбу, нават коштам пранікнення ў лагер ворага і часовага служэння яму дзля будучай помсты», «Міцкевіч падступіў да мастацкага асваення ўплыву асобы на ход гісторыі» (с.85)

Конрад Валенрод – гістарычная асоба, магістр тэўтонскага ордэна, але паэт дабаўляе імя Вальтэр і прозвішча Альфа. У каментарыях паэт гаворыць пра нямецкага рыцара Вальтэра, паланёнага літоўцамі, які таемна ажаніўся з дачкою Кейстута і ўцёк з ёю з Літвы. Аднак Конрад не зрабіў не так. Гэта гістарычная асоба ўвогуле вельмі супярэчлівая, лёс Валенрода мае шмат белых плям, якія Міцкевіч творча запаўняе, хаця ў каментарыях падкрэслівае, што расказаная ім гісторыя – не выдумка, а гіпотэза лёсу Валенрода. Нямецкія храністы не маглі растлумачыць дзіўныя учынкі Конрада, аднак Міцкевіч прапануе сваю версію: герой па паходжанні быў ліцвінам, а крыжаком стаў, каб адпомсціць тэўтонам за паражэнні яго суайчыннікаў. Чытач не ведае праўды пра Валенрода, рамантычнай таямнічасці надае і з'яўленне дзяўчыны з чужых краёў, дабравольна заточанай у вежы, спевы якой хвалююць сэрца Конрада (у фінале высвятляецца, што гэта Альдона). З песні Вайдэлота на піры рыцараў становіцца вядома пра каханне Альфа, выхаванага ў немцаў, і Кейстутавай дачкі, пра іх шлюб, няроўную барацьбу Кейстута з зяцем супраць немцаў, знікнене Вальтэра  ўслед за ім жонкі.

У твор уключана <u>«Альпухарская балада»</u>, у якой распавядаецца пра мусульманскага караля, што нібыта прыйшоў прасіць сяброўства ў заваёўнікаў яго краіны, а на самой справе прыйшоў адпомсціць: хворы на чуму, заразіў сваіх ворагаў. Песня Вайдэлота развярэдзіла душу Конрада, ён павёў крыжакоў на бой з ліцвінамі, але наўмысна неправільна распражаўся войскамі. Войскі немцаў былі разбіты, моц ордэна падарвана, Літва адпомшчана. А.Міцкевіч праводзіць ідэю пра тое, што мастацтва, паэзія здольна падтрымаць і абудзіць дух народа.

Крыжакі разгадалі таямніцу Конрада і вырашылі пакараць яго смерцю, аднак ён выпівае атруту і прапануе зрабіць зелле свайму вернаму служку Гальбану. Той адмаўляецца, бо ён павінен данесці праўду пра подзвіг Конрада яго землякам.

Паэма толькі на першы погляд гістарычная, на самой справе яна надзённая, актуальная, палітычнага зместу. Аўтар разважае над лёсам Літвы, якой пагражае вораг. М.Хаустовіч называе паэму творам канспіратыўнай паэзіі. Эпіграф – цытата з Макіявелі пра львоў і лісіц – паказвае, што барацьба можа быць рознай. Цэнзар пры падрыхтоўцы твора ў друк выкрасліў толькі 1 радок, у якім заключаецца асноўная ідэя твора: «Ты – раб, а адзіная зброя раба –

хітрасць». Удзельнікі Лістападаўскага паўстання 1830 года гаварылі, што яны выхаваны паэмай «Конрад Валенрод».

У 1829 годзе Міцкевічу пакідае межы Расійскай імперыі, едзе ў Еўропу, дзе знаёміцца з Гётэ, наведвае лекцыі Гегеля. Калі становіцца вядома пра паўстанне на роднай зямлі, а пазней пра яго паражэнне, паэт асэнсоўвае прычыны гэтага. З'яўляюцца творы «Смерць палкоўніка», «Рэдут Ордона». Паэт аб'ездзіў шмат краін Еўропы – Германію, Чэхію, Швейцарыю, Італію, Францыю. Жыў у Рыме, Дрэздэне, Жэневе (у 1832 годзе ў Дрэздэне напісаў трэцюю частку «Дзядоў»).

Трэцяя частка «Дзядоў» была напісана ў Дрэздэне і выдадзена ў 1832 годзе. Па сутнасці гэта быў новы самастойны твор, хоць і звязаны з папярэднімі часткамі. Барацьба за незалежнасць стала пафасам твора, у аснову якога пакладзены працэс над філаматамі. У III частцы апісваецца час знаходжання Міцкевіча і яго сяброў у турме. З пралога чытачы даведваюцца пра пераўтварэнне Густава ў Конрада, якое звязана з датай арышту Міцкевіча. Так 1 лістапада 1823 года пакутнік Густаў памірае, а нараджаецца Конрад-змагар. Такім чынам, можна сцвярджаць, што адбыліся змены ў светапоглядзе самаго паэта, ён паставіў прад сабой новыя мэты, каханне ўжо не было для яго асновай жыцця, на першы план выйшла грамадская дзейнасць. Аўтар апісвае свае ўспаміны гэтага часу, дейнічаюць яго сябры, паказваецца роля кожнага з іх, гучаць словы развітання з імі.

Дзеянне І акта адбываецца ў вязніцы, у вобразах заняволеных паэт выводзіць пад сапраўднымі або вымышленымі імёнамі сваіх сяброў-філарэтаў: Тамаша Зана, Ігната Дамейку (Жэгота), Фелікса Кулакоўскага, ксяндза Львовіча і інш., сам выступае пад імем Конрада. Побач з героямі, прататыпамі якіх былі рэальныя людзі, у III частцы паўстаюць вобразы злых духаў, што змагаюцца за душу Конрада. З вязніцы дзеянне пераносіцца ў дом сенатара, у Варшаўскі салон. Конрад сутракаецца з ксёнзам, капралам, бачыць жанчыну, што моліцца за вязня. Узгадваюцца падзеі з гісторыі, ім даецца адзнака, гучыць ідэя забранай бацькаўшчыны, неабходнасць яе вызвалення.

Затым чытач патрапляе ў спальню сенатара, дзе двое чарцей знаходзяцца каля ўзгалоўя. Аўтар паказвае ўсе заганы душ тых, хто кіруе людзьмі. У варшаўскім салоне сустракаюцца асобы вышага свету. Праз дыялогі закранаюцца шматлікія пытанні: месца і роль чалавека на зямлі, мастацкай творчасці,- узгадваюцца падзей тагачаснага жыцця. Заканчваецца частка апісаваннем ночы Дзядоў.

У сцэне «Ноч Дзядоў» зноў з'яўляецца вобраз Гусляра, а таксама вобраз жанчыны. Яны шукаюць Густава сярод духаў, але не знаходзяць (Густаў фізічна жывы). Жанчына пазнае каханага сярод тых, што ад'язджаюць на

поўнач (высылка ў Расію), і бачыць ў яго змененым абліччы сляды вялікіх пакут.

Урывак прысвечаны уражанням Адама Міцкевіча ад падарожжаў па Расіі. Раздзелы «Дарога ў Расію», «Прыгарады сталіцы», «Пецярбург», «Помнік Пятру Вялікаму», «Агляд войска», «Аляшкевіч», «Сябрам маскалям» (прысвечаны дзекабрыстам Кандрацію Рылееву і Аляксандру Бястужаву) – своеасабліввыя паэтычныя ўспаміны пра час знаходжання А.Міцкевіча ў Расіі. Аўтар паказаў стан грамадскага жыцця, адносіны паміж панамі і сялянамі, адсутнасць вольнадумства, адносіны простага народа да цара. У апошнім вершы «Сябрам-маскалям» ён піша, што напісаў гэтыя радкі дзеля таго, каб абудзіць у іх жаданне «ашыйнік звыклы зняць».

Паэт пасяліўся ў Парыжы, чытаў у Каледжы дэ Франс курс лекцый па славянскіх літаратурах, у якіх гаварыў пра мову беларускага народа, называў яе «самай гарманічнай і з усіх славянскіх моў найменш змененай .. гэта найбольш багатая і найбольш чыстая гаворка, якая даўноз’явілася і цудоўна распрацавана».

У 1834 годзе Міцкевіч ажаніўся з Цалінай Шыманоўскай, дачкой піяністкі Марыі Шыманоўскай (за час шлюбу стаў бацькам 6 дзяцей).

Завяршыў працу над паэмай «Пан Тадэвуш, або апошні наезд у Літве. Шляхецкая гісторыя 1811-1812 гадоў». Назву неабходна патлумачць. Што такое наезд? Чаму апошні? Чаму выбраны менавіта гэты час? У часы Рэчы Паспалітай выкананне судовых рашэнняў было складанае, таму што выканаўчыя ўлады не мелі амаль ніякай паліцыі, а заможныя магнаты мелі цэлыя палкі, таму, атрымаўшы рашэнне судаісцец разам з возчым і дэкрэтам на руках ажыцяўлялі наезд. Наезд – узброенае выкананне дэкрэта. Апошні наезд, таму што законы Рэчы Паспалітай не дзейнічалі на тэрыторыі Расійскай імперыі. Час барацьбы з Напалеонам звязваўся з надзеяй адраджэння Рэчы Паспалітай і ВКЛ у яе межах.

Галоўны герой Тадэвуш – малады чалавек, названы ў гонар Тадэвуша Касцюшкі, які прыязжае да свайго дзядзькі Сапліцы, вяртаецца ў мясціны любімыя з маленства. Як і большасць герояў, ён лічыць сябе ліцвінам па нацыянальнай прыналежнасці, палякам – па дзяржаўнай.

Кніга першая «Гаспадарка» пачынаецца гімнам Літве, прасякнутым настальгічным сумам: «Літва! Ты, як здароўе ў нас, мая Айчына!.. / Што варта ты, ацэніць той належным чынам, / Хто цябе ўтраціў. Вось красу тваю жывую / Зноў бачу і апісваю, бо скрозь сумую» (пераклад П.Бітэля). У эпілогу, пры жыцці аўтара не апублікаваным, паэт звяртаецца да Польшчы са словамі «О Маці Польшча!» Апяваючы родную Літву, ён разам з тым выступе за

вызваленне Польшчы, якую разумее як агульную федэратыўную дзяржаву палякаў, літоўцаў і беларусаў.

Асноўная сюжэтная лінія твора – маёмасныя спрэчкі шляхецкіх родаў Сапліцаў і Гарэшкаў. Ключнік Гервазы падбівае Графа (апошняга з Гарэшкаў) на вайну супраць Суддзі, таму што пакляўся адпомсціць за смерць свайго гаспадара Стольніка. Гэта адбываецца, калі востра стаіць пытанне вызвалення Бацькаўшчыны. Аўтар паказвае недарэчнасць таго, чым займаецца шляхта.

Стольнік загіуў ад рукі бацькі Тадэвуша – Яцака Сапліцы. Яцак кахаў дачку Стольніка, які даваў надзею на шлюб, але Эву аддаюць за іншага. У яе нараджаецца дачка Зося. Сам Яцак ажаніўся, у яго ёсць сын Тадэвуш. Аднак каханне не дае спакою, і вось аднойчы, малады чалавек бачыць Стольніка ў яго замку і забівае яго. У гэты час на замак нападаюць маскалі, Яцака абвінавачваюць у забойстве і ў здрадзе, ён вымушаны бегчы з родных мясцін. І толькі перад серцю Яцака Сапліцы (ксёнз Робак), які выратаваў апошняга з Гарэшкаў, Гервязы прызнаецца, што Стольнік дараваў Яцаку яго ўчынак. Такім чынам, маёмасныя спрэчкі наогул губляюць свае значэнне. Тым больш, што ворагі аб’ядналіся ў барацьбе супраць маскалёў (разгром атрада маёра Плута, выступленне на баку французаў ў вайне 1812 года).

Разам з тым паэма з’яляецца ўспамінам пра родны край. Сапліцова – гэта фактычна Туганавічы, сядзіба Верашкаў, дзе Міцкевіч праводзіў вакацыі і сустрэў саё каханне. Аўтар маштабна паказаў жыццё шляхты, яе звычаі (гасцяванне, ловы, наезд, карчма), перадаў настроі. Усе вобразы, усе рэаліі твора паэт браў з успамінаў пра беларускую зямлю. Сам аўтар гаварыў пра паэму-эпапею: «Што там самае лепшае – гэта напісаныя з натуры вобразы нашай радзімы, нашых звычаяў і нораваў».

У верасні 1855 года А.Міцкевіч едзе ў Канстанцінопаль як прадстаўнік ад французкага урада. 26 лістапада паэт памірае. Пахаваны ў Кракаве.

Творчасць А.Міцкевіча аказала вялікі ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. У 1830-я – 40-я гг. у польскай літаратуры склалася так званая беларуская школа, прадстаўнікі якой пісалі на тэмы з народнага беларускага жыцця. Пад уплывам паэзіі А.Міцкевіча сваю літаратурную творчасць пачалі Я.Баршчэўскі, А.Рыпінскі, У.Сыракомля. Адчулі яго уплыў таксама В.Дунін-Марцінкевіч, В.Каратынскі. Ф.Багушэвіч. Тыпалагічныя сувязі з рамантызмам Міцкевіча мае паэма «Сон на кургане» Я.Купалы, з эпапеяй «Пан Тадэвуш» – «Новая зямля» Я.Коласа, многія творы маладнякоўцаў і інш.

Літаратура

Лапидус Н.И., Малюкович С.Д. Литература XIX века: Учебное пособие для вузов / Под ред. Я.Н. Засурского. – Мн.: Университетское,1992. – 271 с.

Мархель У.І. Шлях да Беларусі: Адам Міцкевіч – прадвеснік адрадэння беларускай літаратуры. /У.І.Мархель; НАН Беларусі. Ін-т літ. імя Я.Купалы. –2-е выд., дапрац. Мн.: Бел.навука, 2003.—123 с.